# ВІНШУЕМ З ЮБІЛЕЕМ!

УДК 378.4:[008+7](476-25)+929(476)"19/20" Яцэвіч М. А.

## Мікалай Аляксандравіч Яцэвіч (Да 60-годдзя з дня нараджэння)



Мікалай Аляксандравіч Яцэвіч нарадзіўся 17 жніўня 1955 г. у вёсцы Сімакава Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. У 1972 г. скончыў Мірскую СШ і паступіў у Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны тэхнікум імя А. С. Пушкіна, які скончыў з адзнакай у 1974 г. У гэтым жа годзе паступіў на факультэт бібліятэказнаўства і бібліяграфіі Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, а ў 1978 г. скончыў Мінскі інстытут культуры (МІК), які быў утвораны на базе названага факультэта.

Пасля заканчэння інстытута на працягу чатырох гадоў (1978–1982) М. А. Яцэвіч працаваў бібліёграфам у бібліятэцы МІК. Ён займаўся інфармацыйным забеспячэннем навукова-даследчых работ (НДР) інстытута і дыферэнцыраваным інфармацыйным абслугоўваннем яго кіраўнікоў. У службовыя абавязкі ўваходзіла таксама рэгістрацыя тэм НДР інстытута і справаздач аб іх выкананні ў тагачасным Усесаюзным навукова-тэхнічным інфармацыйным цэнтры (г. Масква). У гэты ж час Мікалай Аляксандравіч з'яўляецца і выкладчыкам-сумяшчальнікам кафедры тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі, друкуе першыя артыкулы, пры тым адразу ў маскоўскіх выданнях. У 1982 г. праходзіць павышэнне кваліфікацыі ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі інфармацыйных работнікаў (г. Масква).

У 1982 г. Мікалай Аляксандравіч паступіў у мэтавую аспірантуру Ленінградскага дзяржаўнага інстытута культуры імя Н. К. Крупскай на кафедру інфарматыкі і тэхнічных сродкаў. Аспірантуру скончыў у снежні 1985 г. з абаронай кандыдацкай дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па праблемах фармалізацыі згортвання тэкставай інфармацыі. Пасля заканчэння аспірантуры з 1985 г. па 1992 г. працаваў выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам кафедры агульнай бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры. У студзені 1992 г. рашэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нем Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі яму прысуджана вучонае званне дацэнта.

З 1992 г. па 1995 г. М. А. Яцэвіч – загадчык кафедры інфарматыкі і тэхнічных сродкаў, а з 1995 г. па сакавік 2003 г. – загадчык кафедры аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры. З красавіка 2003 г. на сённяшні дзень – дэкан факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў.

На працягу навукова-педагагічнай дзейнасці М. А. Яцэвіч выкладаў розныя вучэбныя дысцыпліны: «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы», «Інфарматыка», «Інфармацыйны рынак», «Сістэмы інфармацыі на прадпрыемстве» і інш. Ім распрацаваны аўтарскі вучэбны курс «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» і выдадзена адпаведная тыпавая праграма для ўніверсітэтаў культуры.

Мікалай Аляксандравіч аўтар каля 100 навуковых і навукова-метадычных прац, прысвечаных актуальным праблемам фармалізацыі згортвання тэкставай інфармацыі, аўтаматызацыі бібліятэк, інфармацыйнаму рынку, падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў. Пад яго кіраўніцтвам абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі. З'яўляецца шматгадовым сябрам спецыялізаванага савета па абароне кандыдацкіх дысертацый на саісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 05.25.03 Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства, кіраўніком навуковых груп па распрацоўцы адукацыйных стандартаў трох пакаленняў: па спецыяльнасцях «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» (1999, 2008) і «бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» (2013), тыпавых і вучэбных планаў; навуковым рэдактарам шэрагу зборнікаў артыкулаў.

М. А. Яцэвіч адзін з распрацоўшчыкаў «Канцэпцыі развіцця бібліятэчнай справы Беларусі» (1992), «Канцэпцыі інфармацыйнага ўзаемадзеяння бібліятэк Беларусі» (2001), тэрміналагічных стандартаў, гранта «Стварэнне аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы Беларускага ўніверсітэта культуры вытворча-вучэбнага прызначэння» (1998), які атрымаў фінансаванне фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Удзельнічае ў рабоце міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцый, семінараў, круглых сталоў па пытаннях бібліятэчнай справы і падрыхтоўкі кадраў. На працягу 10 гадоў быў сустаршынёй секцый па бібліятэчнай адукацыі і аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэмах на адной з самых вядомых у свеце міжнародных канферэнцый «Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса» (Аўтаномная Рэспубліка Крым, г. Судак). Пастаянна павышае кваліфікацыю: стажыраваўся ў ЗША (1998), знаёміўся з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасцю буйнейшых бібліятэк і ўніверсітэтаў Польшчы (1990, 2006), Германіі, Францыі (2006), Швецыі, Нарвегіі, Даніі (2007), Чэхіі, Італіі (2008) і іншых; стажыраваўся ў Беларускім інстытуце сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы, у РІВШ.

Мікалай Аляксандравіч займаецца грамадскай дзейнасцю. Ён сябра Рэспубліканскага бібліятэчнага савета пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, рэдкалегіі часопіса «Бібліятэчны свет».

Неаднаразова ўзнагароджваўся ганаровымі граматамі ўніверсітэта і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, іншымі граматамі і падзякамі. У 2004 г. узнагароджаны ганаровым нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі».

Мікалай Аляксандравіч Яцэвіч адзін з самых вядомых на постсавецкай прасторы спецыялістаў – арганізатараў вышэйшай бібліятэчнай адукацыі. Вось ужо 37 гадоў як ён мае адзіны запіс у сваёй працоўнай кніжцы: Мінскі інстытут культуры – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Гэта сведчыць пра самаадданасць той справе, якой ён займаецца, а таксама роднай установе.

Калектыў БДУКМ, студэнцкая моладзь, сябры і калегі вельмі цэняць і паважаюць Мікалая Аляксандравіча, захавальніка традыцый, закладзеных з дня заснавання ўніверсітэта, у руках якога знаходзіцца такі складаны механізм, як факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый, дзе студэнты набываюць рознабаковыя веды і становяцца сапраўднымі прафесіяналамі, а выкладчыкі адточваюць сваё майстэрства і дасягаюць значных вынікаў.

Ад усяго сэрца віншуем Вас з юбілеем і жадаем энергіі, сіл і бясконцага цярпення на гэтай адказнай пасадзе, заставацца мудрым і справядлівым, добрым, чалавечным і шчаслівым!

Ваша чароўная ўсмешка стварае настрой факультэта і дапамагае творча працаваць на карысць вялікай высакароднай справе – росквіту беларускай бібліятэчнай культуры і адукацыі!

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ